**ЖАНЧЫНЫ РОДУ РАДЗІВІЛАЎ У ГІСТОРЫІ КРАЮ**
**WOMEN OF THE RADZIWILL FAMILY IN THE REGION'S HISTORY**

Шасцярнёва Лілія Георгіеўна
Мінск, Беларусь

Ключавыя словы: род Радзівілаў, Кацярына Радзівіл з роду Сабескіх, Уршуля Радзівіл, Соф’я Радзівіл, Крысціны Яўфіміі Радзівіл, Альжбета Яўхімія Вішнявецкая, Магдалена Катажына Радзівіл.

Резюме. В материале показана роль женщин рода Радзивилл в истории Великого княжества Литовского. Многие из них были щедрыми меценатками культуры и искусства, образцом христианского милосердия и доброты.

Keywords: race Radziwill, Catherine Radziwill kind of Sobieski, Ursula Radziwill, Sophia Radziwill, Yavfimii Christina Radziwill, Elizabeth Euphemia Vishnevetskii, Magdalena Katarzyna Radziwill.

Summary. The material shows the role of women of the Radzivill family in the history of the Grand Duchy of Lithuania. Many of them were generous patrons of culture and art, a model of Christian mercy and kindness.

Дынастычнае імя *Радзівілы* прадстаўляе адзін з самых знакамітых магнацкіх родаў ВКЛ. Розныя прадстаўнікі гэтай сям’і далі Рэчы Паспалітай і Вялікаму Княству Літоўскаму гетманаў, канцлераў, мудрых дзяржаўных палітыкаў, кардыналаў. Радзівілы ў сваіх гарадах і маёнтках адкрывалі школы і друкарні, збіралі архівы, бібліятэкі, вядомы як мэцэнаты і заснавальнікі мануфактур.

У цяперашні час існуе дастаткова шмат тэкстаў на польскай, беларускай, літоўскай, англійскай, рускай і іншых мовах, якія прысвечаны вывучэнню роду, яго ўнёску ў гісторыю.

Прозвішча *Радзівілы* шырока прадстаўлена ў шматлікіх энцыклапедычных выданнях. Напрыклад, экцыклапедыя «Вялікае княства Літоўскае» ўключае артыкул аб 50 найбольш важных прадстаўніках роду Радзівілаў. Тут згадваецца *Радзівіл Осцікавіч* – пачынальнік дынастыі, *Соф’я Радзівіл* – беларуская святая, *Ганна Кацярына* – мецэнатка, *Францішка Уршуля Радзівіл* – драматург і паэт, грамадскі дзеяч, *Мікалай Радзівіл Чорны* – заснавальнік Брэсцкай і Нясвіжскай тыпаграфій і буйнейшых цэнтраў пратэстантызму, *Мікалай Кшыштаф Радзівіл Сіротка* – заснавальнік Нясвіжскай ардынацыі і інш.

Як і ў кожнага ўплывовага роду, гісторыя магнатаў Радзвілаў мае два бакі: мужны, смелы, – мужчынскі, і вытанчаны, адданы – жаночы. Але значная колькасць жанчын з роду Радзівілаў пакінула не менш прыкметны след у гісторыі. Многія з гэтай дынастыі былі добрымі мецэнаткамі культуры і мастацтва, узорам хрысціянскай міласэрнасці, пакоры і дабрыні. Напрыклад, Кацярына Радзівіл з роду Сабескіх амаль дваццаць гадоў пасля смерці мужа кіравала ардынацыяй. Нясвіжская княгіня займалася філантропіяй, дапамагала ўсім, хто меў у гэтым патрэбу. Сама стварала сваімі рукамі прыгожыя вырабы, якія пасля ахвяравала ўбогім. На свае грошы пабудавала некалькі шпіталяў, адзін з іх у Міры. Таксама на свае сродкі прызначала пенсіі бедным, клапацілася аб кінутых бацькамі дзецях. Рабіла вялікія ахвяраванні касцёлам. У гэтай жанчыны быў складаны лёс: яна пахавала чацвёра дзяцей. Кацярына Радзівіл мела свае «пустынкі», дзе малілася ў адзіноце. Усім сэрцам звярталася яна да Бога. Па некалькі тыдняў малілася ў кляштары, а потым пешшу абыходзіла ўсе касцёлы. Сярод свайго акружэння нясвіжская княгіня лічылася «Кацярынай Мудрай».

Ганна Кацярына Радзівіл, у дзявоцтве Сангушка, таксама была мецэнаткай, ціхай і цярплівай, вельмі набожнай. У сваіх вотчынных вёсках яна заснавала шэраг мануфактур (дзейнічала фаянсавая, ганчарная, ткацкая мануфактура). Менавіта яна заснавала ў Налібоках у 1717 годзе шкляную мануфактуру. Тут была засвоена тэхніка рэльефнай разьбы па крышталю, адліванні медальёнаў, на якіх гравіраваліся партрэты, кубкі для падарункаў каралям, сябрам і родным. Ганна Кацярына залажыла люстэркавую майстэрню, дзе выраблялся крышталёвы посуд для сервіроўкі стала і дэкаратыўныя рэчы для інтэр’ераў. Княгіня вельмі клапацілася пра адукацыю мясцовых жыхароў.

У знак жалобы па памерлых дзецях, якія не дасягнулі паўналецця, Ганна Кацярына абяцала да канца сваіх дзён насіць чорнае жалобнае адзенне. Такой мы яе і бачым на партрэце, які быў напісаны ў XVIII стагоддзі і захаваўся да нашых дзён. З пятнаццаці народжаных ёю дзяцей сямёра памерлі ў дзяцінстве. Польскі гісторык і пісьменнік Юзаф Крашэўскі падае своеасаблівую легенду ў якой расказвае, як маці напярэдадні вяселля страчвае прыгажуню-дачку. Калі ўжо ўсё было прыгатавана да ўрачыстасці, запрошаны госці, нявеста раптоўна памірае. І тады маці дала абет да канца жыцця хадзіць у чорным. Толькі глыбокая вера ў Бога дапамагла ёй перажыць смерць дзяцей.

Ганна Кацярына мужна трымала выпрабаванне лёсу і правяла шэраг рэформ, аднавіла эканамічны патэнцыял сям'і. З яе ініцыятывы адкрываліся школы для падрыхтоўкі мастакоў і рамеснікаў, будаваліся грэблі, масты, дарогі, млыны, заводзілася жывёла галандскіх парод.

Францішка Уршуля (1705-1753 г.) з Вішнявецкіх праславіла род Радзівілаў не менш за свайго мужа Міхаіла Казіміра Радзівіла Рыбанькі. Яна заснавала Нясвіжскі тэатр Радзівілаў, напісала 16 п'ес, наладжвала літаратурныя салоны, аднавіла і папоўніла княжацкую бібліятэку ў Нясвіжы, займалая культурна-асветніцкай дзейнасцю. Яе нясвіжскі тэатр стаў ўзорам для ўсіх магнацкіх труп. Сюжэты для сваіх твораў Уршуля брала з антычнай міфалогіі, народных казак, сярэдневякой драмы. У год на сцэне тэатра ставілася па 8-12 спектакляў па п'есах княгіні, выканаўцамі роляў былі члены княжацкай сям'і, госці, прыдворныя настаўніка спеваў і танцаў, кадэты Рыцарскай школы.Яна аўтар каля 80 дыдактычных, пахавальных, лірычных і філасофскіх вершаў, парэтрэтаў, загадак. Драматургія Уршулі Радзівіл развіваласвя пад уплывам французскага і італьянскага тэатраў. Дзякуючы Уршулі ў Нясвіжы ставіліся балетныя і оперныя пастаноўкі.

Дзякуючы намаганням Францішкі Уршулі Радзівіл у XVIII ст. Нясвіж стаў цэнтрам культурнага прыцягнення. Тут быў створаны першы пастаянны тэатр «Комедихауз», які набыў славу далёка за межамі краіны. Прадстаўленні тэатра даваліся як у Нясвіжы, так і ў раскошнай летняй рэзідэнцыі Радзівілаў - Альбе. Маці Рыбанькі Ганна Катажына Сангушка спачатку «была супраць такога шлюбу, але пазней змірылася з яго [сына] выбарам і нават стала сімпатызаваў Францішка Уршулі, калі ўбачыла, з якой пяшчотай і адданасцю тая ставіцца да яе сына» [2, с. 247].

Разам з мужам Міхаілам Казімірам, Уршуля стварыла музычную, вакальную і балетную школы, а таксама аркестр народных інструментаў. У Нясвіжскім замку захоўваўся архіў Вялікага княства Літоўскага. Замкавая бібліятэка да пачатку 1770 г. налічвала каля 20 тыс. Тамоў. У другой палове XVIII ст. гэта была самая буйная прыватная бібліятэка на землях Рэчы Паспалітай. У карціннай галерэі ў 1770 годзе знайходзілася 984 карціны. Унікальнымі былі калекцыі зброі, нумізматыкі, шматлікія каштоўнасці некалькіх замкавых скарбніц і інш. Усяго ў замку было каля трохсот гасціных пакояў і дванаццаць вялікіх парадных залаў. Асабліва багата былі ўпрыгожаны галерэя і парадныя залы, кожны з якіх меў непаўторны мастацкі вобраз і назва: Залатая залы, Каралеўская залы, Гетманскім, Мармуровая, Зорная, Рыцарская, Паляўнічая і інш. Мармуровая залы была ўпрыгожана чорным мармурам, Залатая - пазалочанымі сценамі і столлю . Паркет ва ўсіх залах быў выраблены са ста парод дрэва, што дазваляла ствараць розныя мазаічныя ўзоры і дэкаратыўныя арнаменты.

Соф'я Радзівіл (Слуцкая) – рэлігійная дзяячка, асветніца, беларуская праваслаўная святая, апошняя з княжацкага роду Алелькавічаў. Соф'я рана асірацела, пасля смерці яе радні ёй адышло ўсё Слуцкае княства. Ва ўзросце 11 гадоў дзяўчынку пасваталі за нясвіжскага князя Януша Радзівіла, сына віленскага ваяводы Крыштафа. Перад вяселлем абвастрыліся фінансавыя спрэчкі двух знакамітых кланаў і Хадкевічы скасавалі заручыны сваёй выхаванкі. Аднак Радзівілы былі зусім не тымі людзьмі, з якімі можна было б так абысціся. Яны рашуча заявілі, што не жадаюць адмаўляцца ад багатай прыгожай нявесты і падалі на Хадкевічаў у суд. Тым не менш, 1 кастрычніка 1600 г., на свята Пакрова Багародзіцы, Соф'я Слуцкая і Януш Радзівіл павянчаліся па праваслаўным абрадзе ў адным з сабораў Брэста. Соф'я шмат увагі аддавала «дабрачынным справам, падтрымлівала праваслаўныя цэрквы і манастыры ў Слуцкім княстве, якое дзякуючы ёй захавала сваё праваслаўнае аблічча» [1, с. 497].

Свой родны горад Слуцк Соф'я Радзівіл ператварыла ў цвярдыню веры: тут, акрамя Слуцкага Троіцкага манастыра, дзейнічала 15 праваслаўных цэркваў. Маладая княгіня не толькі аказвала матэрыяльную і маральную падтрымку духавенству і слуцкім вернікам, якія аб'ядналіся ў Праабражэнскае брацтва, каб процістаяць уніі, але і сама прымала ўдзел у яго справах. Яна выдзяляла сродкі для пабудовы храмаў і бальніц для бедных, учыняла паломніцтвы ў святыя месцы. Соф'і ўдалося пры дапамозе мужа атрымаць каралеўскую грамату, якая забараняла далучэнне праваслаўных вернікаў да уніі ў княгініных уладаннях. Так Слуцк застаўся адзіным горадам Паўночна-Заходняга краю, які захаваў цэласнасць, чысціню і недатыкальнасць вучэння, што асвяціла землі рускія ў 988 г. Дзякуючы дзейнасці княгіні гэты горад паступова стаў рэлігійным і царкоўна-адміністрацыйным цэнтрам Белай Русі [3]

Не менш значным і важным быў жыццёвы шлях манахіні-ігуменні бернардзінскага манастыра Крысціны Яўфіміі Радзівіл, якая была дачкой Станіслава Радзівіла і ўнучкай Мікалая Радзівіла Чорнага. У дзяцінстве дзяўчынку аддалі на вучобу ў манастыр сясцёр бернардзінак, дзе яна вывучала духоўныя рукапісныя кнігі. У 16 гадоў Крысціна Яўфімія прыняла рашэнне застацца ў манастыры. Крысціна Яўфімія кіравала 60 манахінямі, займалася гаспадарчымі справамі, вяла актыўную перапіску з багатымі

сваякамі. Дарэчы, нягледзячы на тое, што Радзівілы былі прыхільнікамі пратэстантызму, яны ніколі не адмаўлялі ў грашовай дапамозе сваёй сваячцы-ігуменні каталіцкага манастыра.

Альжбета Яўхімія Вішнявецкая – вядомая мецэнатка, заснавальніца першага на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага жаночага каталіцкага кляштара ў Нясвіжы, жонка вялікалітоўскага дзяржаўнага дзеяча Мікалая Кшыштафа Радзівіла Сіроткі. Дзякуючы бацькоўскай спадчыне яна разгарнула значную мецэнацкую дзейнасць, падтрымліваючы будаўніцтва касцёлаў, цэркваў, дзейнасць школ, выданне кніг. Арганізавала ў Нясвіжы культурны гурток. Яе дзейнасць была накіравана на падтрымку каталіцкай царквы. За розум і чароўнасць Альжбету Радзівіл празвалі «Нясвіжскай царыцай Саўскай». На яе ўласныя сродкі быў пабудаваны першы ў Вялікім Княстве Літоўскім кляштар бенедыктак.

Не менш прыкметны след у гісторыі пакінула Магдалена Катажына Радзівіл, народжаная Завішы. Яна актыўна дапамагала ўсім, каму магла і пакуль магла. Менавіта на дабрачыннасць ахвяравала гэтая дзіўная жанчына ўсё сваё багацце.

Разам з мужам яна адчыняла беларускія школы ў вёсках і мястэчках, фінансавала прытулкі, дапамагала беларускім студэнтам. Акрамя таго, Мікалай Радзівіл (муж) быў апантаным збіральнікам беларускага фальклору. Пасля смерці мужа, Магдалена цалкам прысвяціла сябе грамадскай дзейнасці. Яна фінансавала выдавецтва “Загляне сонца і ў нашае ваконца”, газету Bielarus, аказвала матэрыяльную падтрымку ў выданні першых кніг Максіма Багдановіча, Канстанцыі Буйло, Максіма Гарэцкага, Ядвігіна Ш., Тараса Гушчы (Якуба Коласа). Яна пералічвала грошы Віленскаму ўніверсітэту, актыўна ўдзельнічала ў працы Мінскага дабрачыннага таварыства. У 1915 годзе яе абралі ганаровым членам Камітэта дапамогі пацярпелым у вайне. Княгіня ахвяравала грошы літоўскай гімназіі, беларускай грэка-каталіцкай семінарыі ў Рыме і на многія іншыя мэты.

Такім чынам, на працягу стагоддзяў жанчыны род Радзівілаў мелі выключную ролю ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Яны не былі палітыкамі і палкаводцамі, не займалі вышэйшыя пасады, не прымалі ўдзел у войнах, але мецэнацтвавалі, займаліся асветніцтвам, былі прыкладам цярплівасці і набожнасці.

Літаратура


1. Вялікае княства Літоўскае : ВКЛ : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкалегія: Г. П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш. Т. 2: К – Я. Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2006. – 788 с.
2. Масленицына, И. Радзивиллы в эпоху интриг и авантюр / И. Масленицына, Н. Богодяж. – Минск, 2013.– 369 с.
3. Соф’я Слуцкая. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.nlb.by/content/uslugi/sotsiokulturnye-uslugi/vystavki/knizhnye-vystavki-2007-2017-/vystavki-2010-goda/proslavlennye-imena/sof-ya-slutskaya-dzyavochae-alelkavich-pa-muzhu-ra/. – Дата доступу: 28.02.2019.


## ЦЕНА СВОБОДЫ - ПРОЦЕСС ЗРЕЛОСТИ ЖЕНЩИНЫ. КОММЕНТАРИЙ К «ЖЕНЩИНЕ ФРАНЦУЗСКОГО ЛЕЙТЕНАНТА»
## THE PRICE OF FREEDOM. A WOMAN’S PROCESS OF BECOMING MATURE COMMENT TO *THE FRENCH LIEUTENANT’S WOMAN*


Э Юйжун

Цицикар, КНР



Ключевые слова: Сара, свобода , цена , зрелость



Резюме: Автор тщательно проанализировал три аспекта цены свободы, которую Сара, героиня “Женщины французского лейтенанта, созданная Джоном Фаулзом, несет читателю. У женщины новое понимание неустанной борьбы и усилий любви к Счастью.



Keywords: Sarah freedom price mature



Summary. The author analyzes the price of freedom the heroine, Sarah created by John Fowles in The French Lieutenant’s Woman payed in the process of becoming mature in three aspects in detail. All this makes readers get to have newer understanding about Sarah, a woman making unremitting efforts for her love and happiness.


约翰·福尔斯创作的《法国中尉的女人》自1969年问世以来，其主题思想、人物特征、艺术手法都在读者和评论家中引起了强烈反响。它“既是小说，又是某一段历史时期的凝缩的图景”。（陆建德，2001：372）人们对这部小说的关注却最终指向了一个中心——